

Фрагмент санета Фёдара Ястраба, фота Міколы Лінніка

# Санетаў вясёлкавы след

У бібліятэцы № 14 імя Ф. Багушэвіча цэнтралізаванай сістэмы дзяржаўных публічных бібліятэк г. Мінска да канца лютага праходзіць фотавыстава Міколы Лінніка «Вясёлкавы след» паводле матываў санетаў Фёдара Ястраба. За назву выставы ўзятая назва другога тома збору санетаў Ф. Ястраба, а за назвы фотапрацаў – радкі з санетаў. Фотавыявы адлюстроўваюць прыгажосць розных куткоў Беларусі і зробленыя цягам апошніх двух дзесяцігоддзяў. Яны дапоўненыя санетамі Ф. Ястраба, што ўражваюць сваёй дасканаласцю, мовай і глыбінёй думкі.

Фатограф М. Ліннік – сябра Беларускага саюза журналістаў, кіраўнік фотагуртка «Пазітыў» Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы г. Мінска. Гэта яго 50-я персанальная фотавыстава, папярэднія праходзілі на розных выставачных пляцоўках у Беларусі і Расіі.

Ф. Ястраб (1953 – 2014) – мастак і пісьменнік, сябра Беларускага саюза мастакоў, старшыня Міжнароднай гільдыі жывапісцаў, кіраўнік галерэйна-выставачнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, мастацтвазнаўца, аўтар і куратар больш як 80-і маштабных праектаў, удзельнік і арганізатар 120-і міжнародных, замежных і рэспубліканскіх выставаў, дацэнт факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, стваральнік унікальнай праграмы па навучанні арт-менеджменту і менеджменту сацыяльна-культурных міжнародных сувязяў.

У адкрыцці выставы, што адбылося 6 лютага, удзел бралі аўтар фотапрацаў і родныя Ф. Ястраба.

*Паводле паведамлення арганізатараў*

